ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
20
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 30 (1516)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Спецвыпуск газеты «Мы — інтэрнацыяналісты» падрыхтавалі студэнты першага курса факультэта журналістыкі. Рэдактар А. Пуціла. Намеснік рэдактара С. Сулкоўскі. Адказны сакратар А. Супрунова.

Карэспандэнты А. Гаршкоў, І. Сакалоў, А. Дземянцьеўскі, С. Кавальчук, Э. Саевіч, С. Арлоўскі, А. Лапцёнак, Ю. Сабасцян, В. Мінкоў.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

## ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА - СЁННЯ - ЗАЎТРА»

### Віншуем

студэнтак Наталлю Лысякову (IV курс, ФПМ) і Алену Румянцаву (III курс, хімфак), Скібу Валянціну (IV курс, філфак), якія ўзнагароджаны ганаровымі граматамі ЦК ЛКСМБ за выдатную вучобу і плённую працу па інтэрнацыянальнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

### Агітбрыгада

студэнтаў з ЧССР нядаўна выступала ў ПТВ-107 г. Мінска. Чэхаславацкія сябры расказалі аб сваёй краіне, паказалі цікавую слайд-праграму. Навучэнцы прафтэхвучылішча прадэманстравалі сваю мастацкую самадзейнасць.

### Адбыўся

двухбаковы семінар камсамольскага актыву гістарычнага факультэта і гарадской арганізацыі СГС (Саюз грэчаскіх студэнтаў). Намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ Аляксандр Самуйліч расказаў аб падрыхтоўцы студэнтаў да XX з'езда ВЛКСМ. На семінары быў падпісаны план сумесных мерапрыемстваў камсамольскай арганізацыі гістфака і гарадской арганізацыі СГС.

### 27 лістапада

ў дыскусійнай зале студэнцкага цэнтра «Гаўдэамус» (вул. Кастрычніцкая, 10-а) адбудзецца чарговае пасяджэнне інтэрнацыянальнага клуба «Палітыкус». Тэма гэтага пасяджэння —«КНР сёння». На яго запрошаны студэнты і аспіранты з Кітая, а таксама ўсе жадаючыя.

Падрыхтаваў
С. СУЛКОЎСКІ.

## ГАЛАСУЕМ ЗА МІР!

Гебрэмарыям Саламон, Алена Літвінава, Муман Бесмела, Алена Супрунова ў час збору подпісаў.



Чытайце фотарэпартаж на 2-й стар.

## На пульсе планеты

### КЛУБ «ПАЛІТЫКУС»

Час ад часу на старонках нашай газеты з'яўляецца аб'ява аб чарговым пасяджэнні клуба «Палітыкус». Што вы ведаеце пра яго? Між іншым, дыскусійны клуб існуе ва універсітэце ўжо 10 гадоў.

КЛУБ БЫЎ створаны па ініцыятыве савецкіх і замежных студэнтаў, якіх хвалююць праблемы сучаснага свету, становішча ў розных кутках нашай планеты. Падзеі ў Нікарагуа, Ліване, Лівіі, Чадзе, на Кіпры, у Індыі, ДРА — усе яны станавіліся тэмамі пасяджэнняў клуба «Палітыкус».

Пасяджэнні «Палітыкуса» дапамагаюць студэнтам не толькі набываць і пашыраць свае веды па таму ці іншаму пытанню, але (і гэта самае галоўнае) дазваляюць даваць правільную ацэнку палітычнаму становішчу ў свеце. Высвятленне умоў канфліктных сітуацый, выразны паказ рэакцыйнай сутнасці імперыялізму, які нагнятае напружанасць у нашым складаным і супярэчлівым свеце, садзейнічаюць выпрацоўцы правільнага марксісцка-ленінскага светапогляду.

Магу з упэўненасцю сказаць, што ў наш трывожны час пытанні палітыкі, вайны і міру, пытанні, якія закранаюць перспектывы развіцця чалавечай цывілізацыі, ніколі не пакідаюць абыякавымі. Новыя савецкія мірныя ініцыятывы, праблемы карэннай перабудовы і далейшага развіцця нашай краіны — усё гэта будучыя тэмы пасяджэнняў клуба.

С. АРЛОЎСКІ.

# МЫ—ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

**Белдзяржуніверсітэт святкуе 25-годдзе падрыхтоўкі спецыялістаў для замежных краін. На пытанні нашага карэспандэнта адказвае прарэктар універсітэта па міжнародных сувязях Аляксандр Віктаравіч ШАРАПА.**

— *Аляксандр Віктаравіч, раскажыце, калі ласка, аб гісторыі навучання замежных студэнтаў у БДУ.*

— Сапраўды, ужо прайшло чвэрць стагоддзя з таго часу, калі БДУ імя У. І. Леніна прыняў першую групу замежных навучэнцаў. Гэта было ў 1961 годзе. З Рэспублікі Куба прыбыла група ў складзе 61 чалавека, за ёй — яшчэ адна. З таго часу колькасць замежнікаў, якія вучацца ва універсітэце, значна ўзрасла. Калі, напрыклад, у 1970—1971 навучальным годзе іх было 136 чалавек, то ў 1985—1986 на 9 факультэтах займаецца 950 чалавек з 81 краіны.

— *Што новага з'явілася ў арганізацыі работы з замежнымі навучэнцамі пасля XXVII з'езда КПСС?*

— Па-першае, мы імкнёмся данесці да кожнага замежніка, ці гэта студэнт, аспірант або стажор, сутнасць і дух рашэнняў з'езда. З гэтай мэтай распрацаваны і ажыццяўляюцца мерапрыемствы савета, партыйнай арганізацыі і дэканата па рабоце з замежнымі навучэнцамі Белдзяржуніверсітэта. Гэта дазволіла палепшыць вучэбна-выхаваўчую работу.

Што датычыць арганізацыі вучэбнага працэсу, то тут мы надаём сваім выхаванцам асаблівую ўвагу з самага першапачатковага перыяду навучання. Шырока выкарыстоўваем індывідуальныя заняткі па рускай мове, спецыяльных дысцыплінах, шэфства, узаемадапамогу.

У сучасных умовах рэзкага абвастрэння ідэалагічнай барацьбы паміж сацыялізмам і капіталізмам, узмацнення ідэалагічных дыверсій імперыялізму ў краінах сацыялізму і краінах, якія развіваюцца, рэктарат, партком, савет па рабоце з замежнымі студэнтамі зацікаўлены ў неабходнасці далейшага павышэння ўзроўню выкладання грамадскіх дысцыплін. Яны заклікаены фарміраваць навуковы светапогляд.

Распрацаваны новы комплексны план падрыхтоўкі, ідэйна-палітычнага, маральна-этычнага і эстэтычнага выхавання замежных навучэнцаў на ўвесь перыяд навучання ў БДУ. Асноўны змест ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы складае вывучэнне замежнымі студэнтамі грамадскіх навук, прапаганда сацыялістычнага ладу жыцця, растлумачэнне стваральнай дзейнасці савецкага народа па ўзмацненню магутнасці сусветнай сістэмы сацыялізму, знешнепалітычнай дзейнасці КПСС у барацьбе за мір, разрадку напружанасці, раззбраенне.

Узмацнілася ўвага да выхавання юнакоў і дзяўчат замежных краін у духу інтэрнацыяналізму і дружбы з савецкім народам. Ва універсітэце сярод замежных студэнтаў праводзяцца шырокія прапагандысцкія кампаніі. Увага канцэнтруецца на глыбокім растлумачэнні сусветна-гістарычнага значэння Перамогі савецкага народа над нямецкім фашызмам і японскім мілітарызмам, якая стала перадумовай утварэння сусветнай сістэмы сацыялізму, а таксама рэзкага ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху і крушэння капіталістычнай сістэмы імперыялізму.

— *У сучасных умовах асаблівыя патрабаванні прад'яўляюцца да асобы будучага спецыяліста, яго маральных якасцей, грамадзянскай пазіцыі. Якія формы пазавучэбнай работы найбольш эфектыўна садзейнічаюць фарміраванню якасцей сацыяльна актыўнай асобы замежнага спецыяліста?*

— На фарміраванне асобы замежнага студэнта робіць уплыў вялікае мноства фактараў. Галоўны з іх — гэта вывучэнне фундаментальных і грамадскіх навук. Але не толькі вучоба садзейнічае фарміраванню асобы. На нашу радасць, навучэнцы праяўляюць вялікую цікавасць да культуры Беларусі, да яе гістарычных помнікаў, мінулага. Савет па рабоце з замежнымі навучэнцамі ідзе ім насустрач: арганізоўваюцца экскурсіі і паездкі ў розныя куткі як Беларусі, так і краіны. У час летніх канікулаў 100 чалавек пабывала на экскурсіях у Ленінградзе, Ташкенце, Рызе, Казані, Вільнюсе, Несвіжы, Міры, 40 — у доме адпачынку «Нарач», 30 — у доме адпачынку «Адлер», 20 — у лагеры працы і адпачынку «Любань», 34 — у студэнцкіх будаўнічых атрадах, 6 — у санаторыях. У ліпені—жніўні замежныя студэнты, якія засталіся ў інтэрнаце, наведалі піянерскія лагеры «Планета», «Ціхія зоры», імя В. Церашковай. Для іх былі арганізаваны экскурсіі па Мінску, у Раўбічы, на гадзіннікавы завод, завод аўтаматычных ліній, на фабрыку каляровага друку. Былі праведзены тэматычныя экскурсіі на ВДНГ, у музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Мастацкі музей. Замежнікі сустракаліся з маладымі пісьменнікамі Беларусі, з творчымі работнікамі газет «Знамя юности», «Вечерний Минск», кінастудыі «Беларусьфільм».

Уся гэта работа накіравана на тое, каб выхаваць сацыяльна актыўную, з высокай грамадзянскай адказнасцю асобу замежнага спецыяліста.

Інтэрв'ю правёў
Ю. САБАСЦЯН.

# «НАМ ПАШАНЦАВАЛА...»

**МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА**

**ЛУ ЮН, старшы выкладчык кафедры рускай мовы інстытута знешніх эканамічных сувязей і знешняга гандлю ў Пекіне, пазнаёміўся з Мінскам амаль год назад. І, як сам прызнаецца, не вельмі з ахвотай, таму што яму хацелася трапіць туды, дзе вядуцца даследаванні па пытаннях міжнароднага гандлю і супрацоўніцтва ў галіне эканомікі, напрыклад, у Маскоўскі інстытут міжнародных адносін.**

— АЛЕ ЦЯПЕР лічу, што мне проста пашанцавала,— гаворыць Лу Юн.— Таму што ў Беларускім універсітэце я сустрэўся з вядомым вучоным, прафесарам Адамам Супруном. Нягледзячы на сваю занятасць, ён не шкадуе на мяне часу, кіруе маёй стажыроўкай, дапамагае знайсці патрэбную літаратуру, раз у тыдзень праводзіць для мяне кансультацыі і з радасцю адказвае на ўсе мае пытанні, нават на тыя, якія не ўваходзяць у кола яго навуковых інтарэсаў. Гэтага надзвычайнага чалавека я ніколі не забуду...

Высокай думкі аб узроўні выкладання і кваліфікацыі спецыялістаў у Беларускім універсітэце і іншыя кітайскія стажоры: старшы выкладчык палітыка-юрыдычнага інстытута Паўднёва-Заходняга Кітая Лі Кайго, старшы выкладчык педагагічнага універсітэта Усходняга Кітая Чжан Хуньюй, старшы выкладчык педагагічнага універсітэта Паўночна-Усходняга Кітая У Сюэшань. Усе яны згодна ківаюць, калі іх калега Чэнь Чжэньшэн з педагагічнага універсітэта Цэнтральнага Кітая гаворыць:

— Беларускіх прафесараў смела можна назваць віртуозамі. Яны ў дасканаласці валодаюць тымі дысцыплінамі, якія выкладаюць, маюць глыбокія веды, уважлівыя, добразычлівыя да студэнтаў.

— Сумленна гаворачы, не зусім задаволены мы толькі універсітэцкай бібліятэкай,— заўважае Чжан Хуньюй.— На наш погляд, яна ўжо стала цеснай для такой буйной вучэбнай установы. Бо тут вучацца 18 тысяч студэнтаў. Але ў цэлым, безумоўна, гэта стажыроўка вельмі карысная для кожнага з нас. Вельмі важна, на мой погляд, і тое, што мы змаглі блізка, «знутры» ўбачыць жыццё ў СССР. Нам спадабалася тут. Мінск — прыгожы горад, а яго жыхары — ветлівыя людзі. Да нас усе адносяцца цудоўна, многа распытваюць аб Кітаі.

— Так, гэта правільна — да нашай краіны ў савецкіх людзей вялікая і добразычлівая цікавасць,— пацвярджае У Сюэшань.— Я, напрыклад, не толькі многа расказваю студэнтам універсітэта аб гісторыі і культуры Кітая, але нават вучу некаторых кітайскай мове. Мае вучні — здольныя, засвоілі па некалькі соцень іерогліфаў, сёй-той вывучыў кітайскія вершы.

На пытанне, як яны праводзяць вольны час, кітайскія стажоры аднадушна запэўніваюць, што такога часу амаль няма. І тым не менш яны шмат паспелі пабачыць і спазнаць: пабывалі ў музеях і на выстаўках Мінска, добра вывучылі горад, а некаторыя з'ездзілі і ў іншыя гарады Савецкага Саюза.

— Зімою мы адпачывалі ў студэнцкім прафілакторыі,— дадае Лу Юн.— Там таксама было цудоўна, мы добра адпачылі і ўмацавалі здароўе. Нават беларускія маразы нас не спалохалі.

— Мы будзем успамінаць Беларусь, Мінск, універсітэт,— гаворыць Чжан Хуньюй.— Мы зразумелі, што савецкія людзі — за добрыя і сяброўскія адносіны з Кітаем. Мы таксама жадаем гэтага: супрацоўніцтва і ўзаемадапамога карысны нашым краінам і нашым народам. Мы на сваім прыкладзе пераканаліся ў тым, што нам ёсць чаму павучыцца адзін у аднаго.

Н. БУЛДЫК.

# МІР У НАШЫХ РУКАХ

**ФОТАРЭПАРТАЖ**

**Мір — справа кожнага. І таму кожны, нават маленькі ўклад у барацьбу за яго — вельмі значны. Такі ўклад зрабілі арганізатары і ўдзельнікі інтэрнацыянальнага студэнцкага фестывалю, прысвечанага Міжнароднаму дню студэнтаў і 40-годдзю МСС (Міжнароднага саюза студэнтаў).**

**Тыя, хто прыйшоў у нядзельны вечар у Палац культуры Белсаўпрафа, сталі сведкамі неўміручага сяброўства моладзі ўсей Зямлі.**

*...ГУЧЫЦЬ вядомая мелодыя песні «І зноў працягваецца бой», студэнты ІІ курса філалагічнага факультэта Ціна Мжаванадзе і Кім Чэн Хо, які прыехаў вучыцца з Карэі, чытаюць верш аб міры. «Прагрэсіўная моладзь, аб'яднаная Міжнародным саюзам студэнтаў,— гаворыць далей вядучая,— стала часткай руху мільёнаў барацьбітоў за мір, нацыянальную незалежнасць і сацыяльны прагрэс».*

*...На сцэне — студэнты з Чэхаславакіі. Разам з вядучымі яны падрабязна расказваюць аб стварэнні МСС. Імення ў Празе ў жніўні 1946 года на Сусветным кангрэсе студэнтаў і быў утвораны Саюз.*

*У пацвярджэнне гэтых слоў мы бачым на экране дакументальныя кадры, знятыя невядомым чэшскім кінааператарам.*

*Год сорак першы...*
*дваццаць другое.*

*Месяц чэрвень. Замест*
*лекцый — вайна.*

*Замест сшыткаў —*
*патроны.*

*Вытрымаць! Выстаяць!*
*Мэта адна.*

Пад мелодыю песні «Жураўлі» на сцэну выходзіць палкоўнік у адстаўцы Аляксандр Саламонавіч Мізрахі. У першыя дні вайны пайшоў ён на фронт і прайшоў яе дарогамі да пераможнага мая 1945-га.

Ветэран вайны расказаў моладзі аб некаторых эпізодах сваёй франтавой біяграфіі і ў заключэнне сказаў:

— Я хачу, каб больш ніколі не было страшэннай вайны. Яна нікому не прыносіла дабра і супраць яе трэба змагацца. А змагацца павінны вы, моладзь, бо за вамі — будучае. Жывіце ў міры і будзьце заўсёды шчаслівымі.

Апошнія словы ветэрана вайны пераносяць нас у дзень сённяшні. На сцэне — моладзь свету. Змяняючы адзін аднаго, з песнямі і танцамі выступаюць студэнты з Кіпра і Нікарагуа, Афганістана і *Іарданіі. Паміж іх выступленнямі быў паказаны фільм аб змаганні нікарагуанцаў за свабоду і незалежнасць сваёй радзімы.*

*Да прысутных звяртаецца ўдзельніца XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве Іна Фойціхава. «На ўсё жыццё я запомню гэтыя дні ў сталіцы нашай Радзімы,— гаворыць яна.— Я яшчэ раз пераканалася ў тым, як імкнецца да міру моладзь усёй планеты. Мы правадзілі шмат цікавых сустрэч з рознымі людзьмі і калектывамі, і заўсёды гучаў заклік: «Няхай заўжды будзе мір!» Гэта самыя актуальныя словы сённяшняга часу».*

*І вось наступае кульмінацыя мітынгу. Студэнтка філфака Валянціна Скіба зачытвае пісьмо студэнтаў БДУ да студэнтаў Каліфарнійскага універсітэта (ЗША) з заклікам актыўна ўключыцца ў барацьбу супраць ядзернай пагрозы. Сваю салідарнасць з пісьмом удзельнікі фестывалю прадэманстравалі апладысментамі.*

*Завяршае мітынг антываенная песня у выкананні студэнткі філфака Людмілы Мельнікавай.*

*Фестываль, прысвечаны Міжнароднаму дню студэнтаў, закончыўся. Што могуць сказаць аб ім замежныя студэнты? На гэтае пытанне я прашу адказаць аднаго з вядучых мітынгу-канцэрта, студэнта філфака Кім Чэн Хо.*

*— Мне вельмі спадабаўся сённяшні фестываль міру — гаворыць Кім Чэн Хо.— Павінен сказаць, што ў нас на радзіме праводзіцца таксама нямала антываенных мітынгаў. І я вельмі ганаруся, што наступны, XIII Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў адбудзецца ў 1989 годзе на нашай радзіме — у Пхеньяне. Я жадаю савецкай моладзі новых поспехаў у барацьбе за мір ва ўсім свеце.*

*...Ужо гучалі першыя акорды дыскатэкі, падрыхтаванай спецыяльна для ўдзельнікаў фестывалю, я ўглядваўся ў твары хлопцаў і дзяўчат, савецкіх і замежных, і бачыў на іх шчаслівую ўсмешку. Гэта шчасце мірнага жыцця: магчымасць кахаць, вучыцца, працаваць, не баючыся за заўтрашні дзень. І міжвольна ўспаміналіся заключныя словы мітынгу: «Студэнцтва! Вазьміцеся за рукі! Адважвайцеся, змагайцеся! Няхай жыве мір, дружба, салідарнасць!»*

*Гэтыя словы гістарычныя, і мы павінны памятаць іх на кожным кроку свайго жыцця, свайго шчаслівага юнацтва, бо кожны з нас падпісаўся пад заклікам: «Я галасую за мір!»*

А. ПУЦІЛА.
Фота А. МАКСІМАВА.







НА ЗДЫМКАХ: Жанна Пуціла запрашае ўдзельнікаў фестывалю паставіць свае подпісы пад заклікам да прагрэсіўнага чалавецтва ўсяго свету; спявае студэнт з Балівіі Джоні Радрыгес! «Я за тое, каб планеце — зорны мір, а не зорныя войны!».

# Адзінства ў імкненні

**АГІТБРЫГАДА**

**Думка арганізаваць ва універсітэце інтэрнацыянальную агітбрыгаду, якая павінна была аб'яднаць студэнтаў розных нацыянальнасцей, спачатку многім здавалася неажыццявімай і нават несур'ёзнай. І толькі цяпер, азіраючыся назад, можна з падзякай успомніць усё тое добрае, што зрабіў за час свайго існавання гэты калектыў.**

ПЕРШЫЯ выступленні перад студэнтамі адбыліся ў 1983 годзе. Толькі тры гады сумеснай творчай працы, а колькі радасных, незабыўных падзей! Гэта і канцэрты ў Мінску на мітынгах, інтэрвечарах, і паездкі па Беларусі — Салігорск, Наваполацк, Полацк, Гродна і апошняя сустрэча, уражанні ад якой свежыя дагэтуль — у Мікашэвічах.

Што ж уяўляе сабой інтэрбрыгада? Гэта людзі з розных кантынентаў, з розным колерам скуры, людзі, якіх аб'ядноўвае любоў да самадзейнага мастацтва і імкненне пазнаёміць савецкіх людзей як мага бліжэй са сваёй радзімай, імкненне захаваць мір на зямлі. І таму за кароткае канцэртнае выступленне гледачы бачаць не толькі экзатычны танец, яркую вопратку і незвычайную пластыку, чуюць не толькі прыгожы голас, які выконвае песні на роднай мове,— яны бачаць і чуюць клопат і турботы, боль і радасць таго ці іншага народа, той ці іншай краіны. І для іх гэтыя боль і трывога перастаюць быць чужымі, гледачы пачынаюць адчуваць сваё дачыненне да вялікай сям'і, імя якой — чалавецтва.

Кожны ўдзельнік гэтага калектыву непаўторны. Вось на сцэну выбягаюць Гіта і Рэкха, і зала быццам ператвараецца ў палац Шахеразады, напаўняецца ўсходняй вытанчанай музыкай. Афганка Трына, якая бліскае чорнымі вачыма, прымушае зачаравацца грацыёзным какецтвам яе танца. Малагасійцы Гі Жэрар і Мамі задумліва выконваюць песні, якія вызначаюцца непаўторнай меладычнасцю. Ахмед Алі і Салям спяваюць аб аманскай дзяўчыне Гуфуль, якую яны лічаць сваёй Кацюшай. Набіль і Лейла напамінаюць аб трагедыі Палесціны, і сэрца міжволі напаўняецца спачуваннем да народа, у якога адабралі радзіму.

Калектыў вялікі, і ўсе ў ім вельмі розныя. Але яны адзіныя ў сваім жаданні несці людзям дабро і прыгажосць свету дзеля міру.

Ц. МЖАВАНАДЗЕ,
А. САЎЧЫК.

# «Я ВУЧЫЎСЯ Ў БДУ!»

ЛЕПШЫЯ ГАДЫ — СТУДЭНЦКІЯ

«Адчувайце сябе як дома. Вашы ініцыятыва і кемлівасць дапамогуць кожны дзень пражыць цікава, з карысцю для сябе і для ўсяго універсітэта»,— гэта першыя словы, з якімі звяртаюцца да замежных студэнтаў супрацоўнікі універсітэта.

*НЕ ПЕРШЫ ГОД сустракае БДУ юнакоў і дзяўчат з розных куткоў зямнога шара, і таму ў нашым універсітэце ўжо склаліся трывалыя традыцыі інтэрнацыянальнага сяброўства.*

*Спачатку госці знаёмяцца з горадам, дзе ў адзінае цэлае спляліся і старажытная гісторыя, і сучаснасць, дзе перад студэнтамі адкрываюцца і краявіды непаўторнай прыроды Беларусі, і старонкі баявой славы горада-героя. Гасцей цікавіць усё. Яны ўсё жадаюць ведаць. Калі сабраць разам адказы студэнтаў на пытанні: «Чым ты цікавішся? Чаму жадаеш вучыцца ва універсітэце?», то атрымаецца калейдаскоп інтарэсаў і захапленняў студэнцтва. Студэнты імкнуцца як мага больш ведаць пра нашу краіну, космас, сучасную навуку.*

*Сярод замежных студэнтаў шмат аматараў фота- і кінасправы, мастацкага чытання. Песня — гэта першая спадарожніца студэнтаў на вечарах адпачынку і ў паходах. Цяжка знайсці на Зямлі людзей, якія б так лібілі песню. І таму юнакі і дзяўчаты з іншых краін ніколі не адмаўляюцца ад запрашэння выступіць. Іх выступленні заўсёды сустракаюць радасна і з захапленнем.*

*І спорт — такі ж пастаянны спадарожнік студэнцкага жыцця. Заняткі па фізкультуры — гэта і турысцкія паходы, і таварыскія сустрэчы па разнастайных відах спорту. А якія яны моцныя і цікавыя саапернікі!*

*Жыццё ва універсітэце не спыняецца пасля заняткаў. Маладых людзей чакаюць самыя розныя прадметныя гурткі: матэматыкі, хіміі, фізікі. Вельмі часта праводзяцца дыспуты, канферэнцыі чытачоў, сустрэчы з цікавымі людзьмі — пісьменнікамі, вучонымі, кампазітарамі.*

*І пашыраюцца далягляды, абуджаецца цікавасць да творчасці, выхоўваецца жаданне пастаянна вучыцца, авалодваць новымі ведамі.*

*Характэрна, што замежныя студэнты вучацца ў БДУ вельмі добра. Паспяваюць па ўсіх дысцыплінах і на радзіму вяртаюцца не толькі больш дарослымі, але і з трывалымі ведамі.*

*Гады вучобы ў Белдзяржуніверсітэце — не вялікі тэрмін, але яго дастаткова, каб набыць неабходныя навыкі будучай прафесіі, каб гэты час застаўся ў памяці светлай старонкай студэнцкага жыцця. Ужо сёння шмат інжынераў, геолагаў, настаўнікаў, журналістаў з гонарам могуць сказаць: «Я вучыўся ў БДУ. Універсітэт дапамог мне авалодаць прафесіяй!».*

А. ЛАПЦЁНАК.

*НА ЗДЫМКАХ: імгненні шматграннага студэнцкага жыцця.*










# РУКУ НА ДРУЖБУ, ТАВАРЫШ!

НАШ АДРАС — САВЕЦКІ САЮЗ

**На падрыхтоўчым аддзяленні універсітэта для замежных грамадзян займаецца 210 чалавек. З 44 краін свету прыехалі юнакі і дзяўчаты ў Мінск. Прыехалі вучыцца. Праз шэсць гадоў яны атрымаюць дыпломы аб вышэйшай адукацыі, стануць добрымі спецыялістамі. А яшчэ — возьмуць з сабой на радзіму мелодыі рускіх песень, успаміны аб насычаным студэнцкім жыцці, гасцінным і утульным інтэрнаце, адрасы савецкіх сяброў.**

МЫ СУСТРЭЛІСЯ і пагутарылі са студэнтамі ПА, праўда, не без дапамогі перакладчыка — вывучэнне рускай мовы ідзе толькі трэці месяц. Навучэнцы з ахвотай падзяліліся з намі сваімі першымі ўражаннямі, расказалі аб сабе.

Норман Марыно прыехаў з Нікарагуа. Ён прымаў актыўны ўдзел ў звяржэнні дыктатуры Самосы, ліквідацыі непісьменнасці, перабудове эканомікі сваёй краіны. Да прыезду ў Савецкі Саюз Норман знаходзіўся на службе ў дзеючай арміі, са зброяй у руках абараняў заваёвы Нікарагуанскай рэвалюцыі.

— На падрыхтоўчым аддзяленні нас, нікарагуанцаў, 15 чалавек. Усе прайшлі праз выпрабаванне рэвалюцыйнымі падзеямі. У Мінску мы ўжо прывыклі, нам падабаецца горад. Адчуваем складанасці з вывучэннем мовы, але я і сябры рашуча змагаемся за веды!

Раджыў Гупта прыехаў з Індыі. Ён ціха прывітаўся з намі, сказаўшы «Здравствуйте». Высветлілася, што Раджыў добра ведае рускую мову, скончыў Дэлійскі універсітэт.

— На радзіме мяне заўсёды цікавілі падзеі ў Савецкім Саюзе. Жадаў бліжэй пазнаёміцца з савецкім народам. І сёння я вучуся іменна ў гэтай краіне, якую лічу лепшай краінай студэнтаў, краінай міру, сяброўства. Разам з усім чалавецтвам я ўважліва сачыў за сустрэчай у Рэйк'явіку і адабраю мірныя ініцыятывы, з якімі выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў.

— Савецкія мірныя ініцыятывы,— дадае Рашыд Бусанд з Марока,— гэта крок да міру. Шкада, што адміністрацыя Рэйгана робіць крок у адваротным напрамку. Я шмат чытаў дома аб вашай краіне. Вельмі хацелася бліжэй пазнаёміцца з яе традыцыямі, наведваў савецкі культурны цэнтр у Марока. Вучыўся я ў французскай місіянерскай школе, меў магчымасць атрымаць адукацыю «тэхніка пры інжынеры», але вырашыў паехаць у Савецкі Саюз. І цяпер мая мэта — атрымаць надзейныя веды, а для гэтага трэба шмат працаваць.

Жонас Лебапа прыехаў з Конга:

— Я таксама марыў вучыцца ў Савецкім Саюзе. Пасля заканчэння пачатковай школы першай і другой ступені атрымаў званне бакалаўра. Куды пайсці вучыцца далей? Па парадзе бацькі я вырашыў ехаць да вас, вучыцца на гідратэхніка.

На нашым аддзяленні займаюцца прадстаўнікі многіх краін свету. Але мы маем адзіную мэту — атрымаць веды. Вельмі адрозніваюцца сацыялістычны лад жыцця, звычаі, і ўсё ж я даўно зразумеў перавагу сацыялістычнага грамадства. Напрыклад, студэнты ў Францыі вучацца за свой кошт. А ў вашай краіне мы знаходзімся на поўным забеспячэнні, карыстаемся бясплатнымі падручнікамі, атрымліваем стыпендыі. Усяго гэтага няма ў студэнтаў капіталістычных краін.

Так, для замежных сяброў усё новае, незвычайнае. І дапамагаюць рабіць ім першыя крокі выкладчыкі падрыхтоўчага аддзялення.

— Студэнты аб'яднаны ў зямляцтвы,— паведаміў намеснік дэкана аддзялення Іван Пятровіч Чэпа.— Напрыклад, самае вялікае — Лаоса — 34 чалавекі. У зямляцтве Конга — 9 чалавек, Марока — 12...

— У нас праходзіць шмат розных мерапрыемстваў з мэтай бліжэй пазнаёміць замежнікаў з жыццём нашай краіны, навучыць іх правільна арганізаваць сваю працу,— далучаецца да гутаркі Генадзь Мікалаевіч Маскаленка, перакладчык, куратар палесцінскага зямляцтва.— У пачатку навучальнага года традыцыйна праводзіцца Дзень ведаў. Студэнты чытаюць любімыя вершы. У снежні адбудуцца Дзень міру, конкурс палітычнага плаката. Нашы навучэнцы пазнаёмяцца з Домам-музеем І з'езда РСДРП, з мемарыяльным комплексам «Хатынь», пабываюць на Кургане Славы, у Брэсце.

Ёсць задача і ў нас, савецкіх студэнтаў.

Іменна мы павінны дапамагчы нашым сябрам бліжэй пазнаёміцца з нашай Радзімай, яе культурай, жыццём савецкіх людзей. Трэба зрабіць так, каб кожны замежны студэнт адчуў сябе сярод сапраўдных сяброў.

А. ДЗЕМЯНЦЬЕЎСКІ,
І. САКАЛОЎ.

## «Набываю веды ў самай перадавой краіне»

РАДКІ З ПІСЬМАЎ

ВОСЬ УЖО трэці год я жыву ўдалечыні ад сваёй радзімы. Я набываю веды у самай перадавой краіне свету — Савецкім Саюзе. І хоць да родных мясцін — тысячы кіламетраў, я не адчуваю сябе чужынцам у вашым горадзе. Інтэрнат № 2 стаў для мяне сапраўдным другім домам.

З лёгкай усмешкай успамінаю аб мінулых цяжкасцях: халодным клімаце, недастатковым веданні рускай мовы. А калі і ўзнікаюць якія-небудзь праблемы ў вучобе, я цвёрда ўпэўнены, што на дапамогу прыйдуць савецкія сябры. Іх у мяне шмат.

Карыстаючыся выпадкам, хачу сказаць вялікае дзякуй тым, хто клапоціцца аб жыцці замежных студэнтаў, аб іх вучобе ў БДУ, дзверы якога заўсёды адчынены для нас. А перш за ўсё я і мае таварышы ўдзячны камсамольскай арганізацыі, якая свае намаганні накіроўвае на тое, каб мы прымалі актыўны ўдзел у грамадскім і палітычным жыцці моладзі вашай цудоўнай краіны, у барацьбе за мір і дэмакратыю, каб замежныя студэнты станавіліся высокакваліфікаванымі спецыялістамі, майстрамі сваёй справы.

*В. МАР'ЯМ,*
*студэнт хімічнага факультэта.*

